# Сцісла пра дзяржаўныя праграмы

У 2016 годзе ў Беларусі пачалося ўкараненне праграмна-мэтавых метадаў планавання з улікам лепшых сусветных практык. Урадам сфарміраваны і Кіраўніком дзяржавы прыняты два сістэмныя ўказы (ад 23 сакавіка 2016 года № 106 «Аб дзяржаўных праграмах і аказанні дзяржаўнай фінансавай падтрымкі» і ад 25 ліпеня 2016 года № 289 «Аб парадку фарміравання, фінансавання, выканання і ацэнкі эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўных праграм».




Першапачаткова бюджэтныя сродкі размяркоўваюцца сыходзячы са стратэгічных мэтаў дзяржаўнай палітыкі. Сёння ўсе дзяржаўныя праграмы накіраваны на комплекснае рашэнне актуальных задач і дасягненне прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Іх падрыхоўка ажыццяўлялася адначасова з распрацоўкай Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 – 2020 гады і ў межах аб'ёмаў фінансавання, вызначаных у адпаведнасці з бюджэтным заканадаўствам, што дазволіла сканцэнтраваць рэальныя фінансавыя рэсурсы на асноўных прыярытэтах, закладзеных у Праграме –2020.




Такім чынам, асноўныя мэты і задачы, вызначаныя на бягучае пяцігоддзе, адлюстроўваюцца ў мерапрыемствах сфарміраваных дзяржаўных праграм.

Менавіта праз рэалізацыю дзяржаўных праграм дасягаецца комплекснае рашэнне актуальных задач у розных сферах сацыяльна-эканамічнай дзейнасці рэспублікі. Акцэнт пры гэтым зроблены на развіцці чалавечага патэнцыялу, якасці і ўмовах жыцця насельніцтва, забеспячэння эфектыўнай занятасці: 7 з 20 дзяржаўных праграм маюць сацыяльную накіраванасць.

## Парадак фарміравання і выканання дзяржаўных праграм

Парадак фарміравання і выканання дзяржаўных праграм вызначаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2016 года № 289.

1. Фарміраванне праекта праграмы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пералікам дзяржаўных праграм. Пералік на 2016 –2020 гады зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 лютага 2016 г. № 148.

2. Адказны заказчык стварае міжведамасную рабочую групу па фарміраванні і выкананні праграмы.

3. Праект праграмы накіроўваецца адказным заказчыкам на ўзгадненне:

заказчыкам;

адпаведным органам мясцовага кіравання і самакіравання (у выпадках, калі прадугледжваецца фінансаванне мерапрыемстваў за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў);

у Банк развіцця, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі, пры неабходнасці – у банкі (у выпадках, вызначаных Указам № 289).

4. Узгоднены праект праграмы накіроўваецца на разгляд пастаяннай міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах.

5. Пасля атрымання станоўчага заключэння камісіі праект праграмы накіроўваецца на ўзгадненне ў Міністэрства эканомікі і Міністэрства фінансаў.

6. Узгоднены праект праграмы ўносіцца адказным заказчыкам у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.



Для каардынацыі работы ў сферы фарміравання і выканання дзяржаўных праграм рашэннем Урада створана пастаянная міжведамасная камісія па дзяржаўных праграмах (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 кастрычніка 2016 г. № 800), якая дзейнічае як калегіяльны орган па разглядзе пытанняў у сферы рэгулявання дзяржаўных праграм.




Кожны дзяржаўны орган, адказны за рэалізацыю дзяржаўнай праграмы, стварае на сваім узроўні міжведамасную рабочую групу па фарміраванні і выкананні праграмы.

Для комплекснага ахопу і кантролю за выкананнем дзяржаўных праграм, якія фінансуюцца за кошт мясцовых бюджэтаў, мясцовымі органамі ўлады сфарміраваны рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў. Гэта дазваляе скаардынаваць галіновы і рэгіянальны ўзроўні планавання, а таксама забяспечыць аператыўны кантроль выніковасці дзяржаўных праграм у адпаведным рэгіёне.

Прынятая сістэма фінансавання праз дзяржаўныя праграмы дазволіла істотна павялічыць ахоп выдаткаў бюджэту.

Так, у 2017 годзе:

ахоп рэспубліканскага бюджэту дзяржаўнымі праграмамі складзе каля 31 % (для параўнання: у 2015 годзе – 15 %),

ахоп выдаткаў кансалідаванага бюджэту дзяржаўнымі праграмамі ацэньваецца на ўзроўні 60,2 % (у 2015 годзе – 13,6 %).

На бягучае пяцігоддзе Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 – 2020 гады вызначана задача забяспечыць ахоп выдаткаў бюджэту дзяржаўнымі праграмамі не менш як на 90 працэнтаў. Для гэтага разглядаецца пытанне аб фарміраванні комплекснай дзяржаўнай праграмы па кіраванні дзяржаўнымі фінансамі (з уключэннем у яе фінансавага сектару, пытанняў страхавання, кіравання дзяржаўным даўгом і рэгулявання міжбюджэтных адносін). Адначасова вызначаюцца падыходы па фінансаванню капітальных выдаткаў праз дзяржаўныя праграмы без фарміравання інвестыцыйных праграм.

**Выдаткі кансалідаванага бюджэту на дзяржаўныя праграмы, %**

